**XXIV рэспубліканскі конкурс «Бібліятэка – асяродак нацыянальнай культуры»**

XXIV рэспубліканскі конкурс «Бібліятэка – асяродак нацыянальнай культуры» завершаны, вынікі падзведзеныя і могуць разглядацца бібліятэкамі як імпульс для новых задумак і планаў.

Конкурс праводзіцца штогод сярод публічных бібліятэк краіны з мэтай павышэння іх ролі ў фарміраванні нацыянальнай самасвядомасці насельніцтва, папулярызацыі нацыянальнай культуры, гісторыі, літаратуры, мовы, народных промыслаў, а таксама падтрымкі і развіцця чытання.

Выявіць наватарскія думкі, свежыя падыходы, інавацыйныя формы і метады працы – гэта галоўная задача кампетэнтнага журы. 13 мая ў Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі адбылося пасяджэнне журы па падвядзенні вынікаў конкурсу, у склад якога ўвайшлі прадстаўнікі Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь, абласных выканаўчых камітэтаў, Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі, абласных бібліятэк, цэнтралізаваных сістэм публічных і дзіцячых бібліятэк г. Мінска, грамадскага аб'яднання «Беларускі фонд культуры».





Традыцыйна конкурс праходзіць у два этапы (абласны і рэспубліканскі) па чатырох намінацыях: «За пошукавую і даследчую працу», «За значны ўклад у выхаваўчую работу з падрастаючым пакаленнем», «За падтрымку і развіццё чытання», «За навацыі ў сферы бібліятэчнай справы». У 2016 годзе ў рэспубліканскім этапе прыняла ўдзел 41 публічная бібліятэка з усіх абласцей нашай краіны.

Сябры журы адзначылі высокую якасць прадстаўленых прац, разнастайнасць увасобленых ідэяў, творчы падыход удзельнікаў.

Па выніках конкурсу будзе выдадзены загад міністра культуры Рэспублікі Беларусь. Пераможцы рэспубліканскага этапу будуць узнагароджаныя дыпломамі першай, другой, трэцяй ступеняў і грашовымі прэміямі.

***Вольга Какшынская, галоўны бібліятэкар навукова-даследчага аддзела бібліятэказнаўства Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі***